947.6(=512.1) «20»

І.Б. Канапацкі

# Становішча татараў у БССР у 20–30-я гады XX стагоддзя

Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны беларускія (літоўскія) татары апынуліся ў складзе трох суверэнных дзяржаў – Польшчы, Летувы і БССР. У БССР знаходзілася амаль 4-тысячная татарская этнічная супольнасць – 3777 чалавек. З іх 558 чалавек (ці 14,9% ад усей колькасці татараў і 0,01% усяго сельскага насельніцтва рэспублікі) былі вяскоўцамі. 3129 татараў (адпаведна 85,1% і 0,38%) былі гараджанамі [1]. Перад вайной у сталіцы БССР г. Мінску жылі 1146 татар. Паводле перапісу насельніцтва 1923 г. – 1.045 (г.зн. іх колькасць зменшылася на 101 асобу). Мужчын было 474, жанчын – 571. Колькасць жанчын нават павялічылася, але вельмі значна зменшылася колькасць мужчын. Абставіны ваеннага часу адыгралі тут, безумоўна, пэўную ролю [2]. Паводле наступнага перапісу, праведзенага ў 1926 г., татарскае насельніцтва ў горадзе складала 1283 чалавекі, г.зн. за тры гады ўзрасло на 243 асобы [3].

Становішча татараў у БССР было складаным і супярэчлівым. У 1920-я гады дзяржаўнымі органамі Беларускай ССР рабіліся спробы нацыянальнага будаўніцтва сярод нацменшасцей краіны. Толькі ў канцы дваццатых гадоў гэтыя мерапрыемствы закранулі і беларускіх татар. Прамых сведчанняў стварэння ўстаноў народнай асветы з навучаннем на татарскай мове на тэрыторыі БССР даследчыкамі не выяўлена. Але разам з тым атрыманы ўскосныя сведчанні пра арганізацыю (ці першыя крокі на шляху да такой) татарскага школьніцтва. Так, у беларускай польскамоўнай газеце «Orka» за 21 студзеня 1928 г. сярод апублікаваных фотаматэрыялаў, што адлюстроўвалі рэаліі тагачаснага развіцця рэспублікі, выяўлены фотаздымак з надпісам «Дзеці ў татарскай школе». Менавіта ў той час была зроблена спроба арганізаваць першасныя структуры гэтай школы: пачатковыя класы, групы па ліквідацыі непісьменнасці. Татарскімі, між іншым, яны маглі быць не толькі ў сэнсе камплектавання. Увогуле ж пытанне аб мажлівай арганізацыі першасных структур татарскага школьніцтва ў Мінску патрабуе больш глыбокага вывучэння. Вядома, напрыклад, што татарам у Мінску пасля рэвалюцыі 1917 г. па вул. Вызвалення была перададзена сямігадовая школа № 26, якая мела афіцыйную назву «Татарская», але пад час нямецкай акупацыі яна была ў іх адабраная. Аб неабходнасці вяртання яе мінскім татарам пісаў у лісце да Нацкамісіі пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце БССР адзін з лідэраў беларускіх татар у Мінску Ях'я Хасанавіч Гембіцкі [4].

Вясной 1928 г. у Татарскай Слабадзе (іншая тагачасная неафіцыйная назва – Татарскі раён) г. Мінска была адчынена татарская хата-чытальня. На адным архіўным фотаздымку, датаваным чэрвенем 1929 г., шыльда на мінскай хаце-чытальні мела беларускі і татарскамоўны надпісы. Апошні быў выкананы татарскім пісьмом [5]. В. Вольскі ў артыкуле «Культработа среди татар», змешчаным у газеце «Рабочий», паведамляў, што ўжо больш за два

месяцы працуе ў Мінску першая ў БССР татарская хата-чытальня. Неабходнасць яе арганізацыі адчувалася ўжо даўно, таму што да гэтай пары сярод татарскага насельніцтва Мінска не вялося ніякай культурнай і палітыка-асветніцкай работы. Агульны сход татарскага насельніцтва, які папярэднічаў адкрыццю хаты-чытальні здзівіў сваёй шматлікасцю: невялікае памяшканне па Вялікай Татарскай вуліцы не змагло змясціць усіх прысутных. На гэтым жа сходзе быў абраны Савет хаты-чытальні з 7 чалавек, з іх 5 членаў КП(б)Б і КСМ, і вызначаны план работы на бліжэйшы час. Пры чытальні працуюць гурткі па вывучэнні татарскай мовы і палітычны. Плануецца арганізаваць гурток «Бязбожнік» і лікбез. На днях выйдзе першы нумар газеты «Татарскае слова». Рэдакцыяй збіраюцца матэрыялы па асвятленні жыцця і быту татарскага насельніцтва і работы хаты-чытальні. Для папаўнення яе фонду з Кніжнай палаты было ўзята каля 60 выданняў на цюрка-татарскіх мовах, а з Пушкінскай бібліятэкі – каля 200 рускіх і беларускіх кніг. Выпісваюцца татарскія, рускія і беларускія газеты і часопісы. Характэрна, што, акрамя татар, хату-чытальню наведвае і навакольнае яўрэйскае насельніцтва, асабліва моладзь. У сувязі з гэтым Савет хаты-чытальні прыняў рашэнне выпісаць дадаткова шэраг яўрэйскіх газет і часопісаў. 12 снежня 1928 г. дацэнтам В.А. Сербента была прачытана лекцыя «Імперыялізм і рэвалюцыйны рух на Усходзе». У далейшым плануецца перыядычнае чытанне лекцый. Татарскую хату-чытальню чакае велізарная праца, тым больш, што з 1283 мінскіх татар налічваецца каля 40 адсоткаў непісьменных. Асноўная работа хаты-чытальні павінна ісці па лініі барацьбы з непісьменнасцю і рэлігіяй. Была пастаўлена сур'ёзная і важная задача – вызваленне татарскага насельніцтва з-пад уплыву мячэці» [4, 97, 8].

Але проціпастаўленне гэтай формы тагачаснага нацыянальнага будаўніцтва мячэцям як традыцыйным асяродкам захавання этнакультурнай спецыфікі татар не дало станоўчых вынікаў. Пры фармальнай вонкава-нацыянальнай афармленасці працэсу вялікая беларусізаванасць татараў была, відаць, прычынай непрацяглага існавання мінскай хаты-чытальні як нацыянальнай культурна-асветнай установы. 8 снежня 1928 г. Мінская акруговая нацыянальная камісія, заслухаўшы справаздачу аб рабоце татарскай хаты-чытальні, адзначала «слабы тэмп разгортвання палітыка-масавай работы сярод татарскага і ваколічнага насельніцтва іншых нацыянальнасцей, у прыватнасці, зусім не праведзена работа ў напрамку асвятлення пытанняў нацыянальнай палітыкі і інтэрнацыянальнага выхавання», канстатавала «нацыянальна-шавіністычныя настроі класава-чужых элементаў у савеце хаты-чытальні», указала, што «мэта хаты-чытальні – абслугоўваць разам з татарскім працоўным насельніцтвам і акраіннае жыхарства іншых нацыянальнасцей таго ж раёну, узяць напрамак на асвятленне палітыкі партыі і Савецкай улады ў нацыянальным пытанні, інтэрнацыянальнае выхаванне мас, папоўніць хату-чытальню літаратурай на іншых нацыянальных мовах, у прыватнасці на яўрэйскай і польскай» [4, 94, 2-3].

У канцы 1929 г. татарская хата-чытальня была пераўтворана ў раённую, г.зн. была пазбаўлена нацыянальнага статуса. Не былі таксама рэалізаваны прапановы Белдзяржмузея па стварэнні экспазіцыі, прысвечанай гісторыі і культуры татар Беларусі.

З заняпадам нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод татараў БССР да сярэдзіны 1930-х гадоў адзінай формай нацыянальнага будаўніцтва сярод татараў рэспублікі заставалася нацыянальна-гаспадарчае будаўніцтва. Татарскае насельніцтва БССР, як і іх суайчыннікі ў Заходняй Беларусі, займалася сваімі адвечнымі заняткамі: агародніцтвам, саматужніцтвам, у гарадах пэўная доля асоб займалася «свабоднымі прафесіямі» ці былі служачымі. Сярод татараў яшчэ ў канцы XIX ст. вылучаліся вайскоўцы, служачыя ў прыват-

ных асоб, землярobы. З даўніх часоў саматужныя промыслы з'яўляліся адным з галоўных заняткаў беларускіх татар. Савецкая ўлада рабіла пэўныя захады для пашырэння розных форм кааперацыі: даваліся крэдыты, змяншаліся падаткі і г.д. Нягледзячы на гэта, стварэнне татарскіх саматужных арцелей затрымлівалася. Уладу непакоіла значная «непралетарская праслойка» сярод татараў.

Я.Х. Гембіцкі, адзін з татарскіх грамадскіх дзеячаў, у лісце, накіраваным у Нацыянальную камісію пры ЦВК БССР 11 ліпеня 1928 г., раіў ураду дапамагчы татарскаму насельніцтву стварыць калектывы саматужнікаў па вырабу скур і аўчын. Гэта мера, на яго думку, павінна была палепшыць сацыяльна-эканамічнае становішча татараў у мястэчках Смілавічы, Узда, Капыль, Смалявічы і г. Мінску [4, 63, 7]. У чарговым лісце, напісаным у Нацыянальную камісію пры ЦВК БССР 5 кастрычніка 1928 г. татарскімі грамадскімі дзеячамі І.А. Міськевічам, І.Х. Мурза-Мурзічам і Я.Х. Гембіцкім, прапаноўвалася ўдзяліць асаблівую ўвагу пашырэнню ведаў па агародніцтве, садаводстве, што вельмі зацікавіла б татараў-агароднікаў. Паведамлялася таксама, што аўтары ліста «для правядзеньня працы па пераходу татараў-гароднікаў ад культуры гародняй да культуры ягаднай і пладовай атрымалі згоду ад прафесара Бурштэйна і аграномаў-садаводаў тт. Турока і Хабэнко». «Акрамя таго, – гаварылася ў лісце, – мы звязваемся са станцыяй Прыкладной Батанікі ў саўгаспадарцы Лошыца для арганізацыі навуковага кіраўніцтва апрацоўкаю гародаў, тым больш, што і станцыя зацікаўлена ў разьвядзеньні «татарскай радысы» [4, 60, 35, 35зв]. Аднак нацыянальныя татарскія кааператывы былі створаны толькі ў пачатку 1930-х гг. у Смілавічах і Мінску [4, 101, 6]. Татарскі калгас у Мінску меў назву «Чырвоны агароднік». Яго старшынёй быў член КП(б)Б Сулейман Хасенавіч Джэнаевіч [6]. Сельскагаспадарчыя кааператывы «Чырвоны Профінтэрн» у Смілавічах і «Чырвоны агароднік» у Мінску існавалі на базе традыцыйных заняткаў татар агародніцтвам.

У 1920-я гады дзяржава праводзіла шэраг эканамічных мерапрыемстваў, якія павінны былі палепшыць гаспадарчае становішча нацыянальных меншасцей. Палітыка землеўпарадкавання местачковага яўрэйскага насельніцтва, актыўная прапаганда перасялення на поўдзень Украіны і ў Крым адбіліся і на беларускіх татарах. 21 лютага 1928 г. у ЦВК БССР з заявай звярнуліся прадстаўнікі татарскіх перасяленцаў з г. Мінска і м. Смілавічы Ізмаіл Раецкі і Мустафа Ждановіч. Яны пісалі: «Мы, земледельцы г. Менска и м. Смиловичи татарской национальности, желаем переселиться в Крымскую Республику на хлебопашество. Считаем себя выходцами из Крыма и желаем переселиться на родину, изучить свой забытый национальный язык, а также желаем организовать исключительно из молодняка молодую коммуну в составе 20 человек. Просим оказать нам помощь в переселении на родину и наделении землей» [4, 63, 33]. З аналагічнай заявай І. Раецкі і М. Ждановіч звярнуліся ў Наркамзем Крыма і Крымскі ЦВК [4, 63, 35]. Наркамзем БССР, у сваю чаргу, 3 сакавіка 1928 г. звярнуўся з запытам «По вопросу о переселении татарского населения в Крымскую ССР» у Наркамзем Крыма. У ім паведамлялася, што «ввиду поступающих у НКЗБ ходатайств от татар (бывших выходцев из Крыма) с просьбой предоставить им право переселения в пределы Крымской ССР с целью заняться сельским хозяйством и учитывая неблагоприятно сложившуюся для них в БССР экономическую обстановку (так как в массе татары занимались, главным образом, кустарным промыслом и мелко-промышленным огородничеством), НКЗБ считает постановку вопроса самим татарским населением о переселении в Крымскую ССР правильным и просит сообщить Ваши соображения по этому вопросу, а также и сведения, необходимые для построения практической программы работ по переселению из БССР татарского населения, желающего переселиться» [4, 63, 32].

10 красавіка 1928 г. сакратар Крымскага ЦВК Мусаніф у лісце прадстаўнікам груп татарскіх перасяленцаў у Беларусі І. Раецкаму і М. Ждановічу паведамляў, што «Крым. ЦИК, в принципе, не возражает против Вашего переселения в Крым при условии, если Наркомзем Белорусской ССР возьмет на себя расходы по Вашему переселению в Крым и водворению Вас на месте. Какой-либо помощи на строительство или на предметы сельскохозяйственного обихода Крым. ЦИКом Вам не может быть оказано из-за отсутствия средств» [4, 63, 31]. Таксама і Наркамзем Крымскай ССР у лісце Наркамзему БССР ад 28 красавіка 1928 г. паведамляў, што «переселение в Крым 20 семейств татар может состояться при условиях, предложенных Крым. ЦИКом Наркомзему БССР, т.е. если последний возьмет на себя все расходы, связанные с переселением указанных 20 семейств в Крым, также с возведением им построек, устроительством колодца и снабжением расселенцев сельхозинвентарем на месте водворения. Что же касается предоставления участка для дополнительного переселения 100–150 душ согласно вашего отношения за № 3655, то за отсутствием свободных расселенческих фондов ходатайство Наркомзема не может быть удовлетворено» [4, 63, 44]. Адначасова паведамлялася, што ў адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 18 студзеня 1928 г. перасяленне ў Крым праводзілася Усесаюзным Перасяленцкім Камітэтам у планавым парадку.

3 мая 1928 г. яшчэ 8 сямей татар-гарбароў з г. Мінска і м. Смілавічы падалі заяву ў Нац. камісію пры ЦВК БССР аб дазволе перасялення ў Крым, дзе яны мелі намер працаваць на зямлі. «Желаем переселиться на родину в Крымскую Республику на культурное хозяйство. На переселение на Родину нас толкает как малоземелье, так и забытый свой родной язык». Заяву падпісалі сем'і Алея Канапацкага, Хасеня Канапацкага, Ібрагіма Канапацкага, Мустафы Багдановіча, Асана Александровіча, Мустафы Гембіцкага, Ізмаіла Раецкага, Хасеня Якубоўскага, а таксама маладыя татары з Мінску Мустафа Ждановіч, Мустафа Хасяневіч, Адам Канапацкі и Алей Багдановіч [4, 63, 37].

Нацыянальная камісія ЦВК БССР, заслухаўшы «Хадайнічаньне гр-н татар аб перасяленьні іх у Крым на земляробства», задаволіла просьбу 8-мі татарскіх сем'яў, як беззямельных, аб перасяленні ў Крым на земляробства і прасіла «Прэзідыум ЦВК БССР даць распараджэнне Наркамзему аб неабходнасці прыняцця мер да задавальненьня гэтых сем'яў у іх хадайніцтве перасяліцца ў Крым на земляробства, адпусціўшы для гэтага сродкі з сум, прызначаных на перасяленьне» [4, 63, 28]. Прэзідыум ЦВК БССР 14 мая 1928 г., разгледзеўшы пастанову Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР «Аб задавальненьні хадайнічаньня 8 татарскіх сем'яў аб перасяленьні іх у Крым», даручыў Нац. камісіі ЦВК «у планавым парадку вывучыць становішча і патрэбы татарскага насельніцтва, якое пражывае ў БССР і распачаць мерапрыемствы па эканамічным і культурным абслугоўванні татар, а таксама і палепшанні іх быту» [4, 63, 27]. Нац. камісіі было даручана таксама прадугледзець магчымасць надзялення татар зямлёй як у межах Беларусі, так і ў іншых рэспубліках, у тым ліку і ў Крыме [7].

Не палепшыла, а нават ускладніла становішча татар-земляробаў прымусовая калектывізацыя. Яна пагоршыла дабрабыт і асновы іх гаспадарчай дзейнасці. Падчас фарсіраваных сацыяльных пераўтварэнняў шырока праводзілася барацьба супраць так званага нацыяльнага адзінства. Трэба адзначыць, што сярод беларускіх татар амаль што не было вялікай класавай дыферэнцыяцыі. Татары, жывучы сваей адасобленай абшчынай, былі пасіўныя ў грамадскім жыцці. Сярод дзяцей і моладзі амаль што не было піянераў і камсамольцаў. На пачатак 1930-х гг. сярод татарскай моладзі ў м. Смілавічы налічвалася 3, а ў г. Мінску – 13 камсамольцаў, з 60 школьнікаў у Смілавічах толькі трое з'яўляліся піянерамі [4, 101, 6; 34, 1, 727].

Такім чынам, жыццё татарскай меншасці ў БССР ішло ў напрамку тых сацыяльна-эканамічных, палітыка-грамадскіх змен, якія мелі месца ў краіне. Аналіз прычын непрацяглага існавання шматлікіх формаў нацыянальнага будаўніцтва сярод татар БССР у гэтыя гады паказвае, што яны былі своеасаблівымі прыладамі для разбурэння як жыццёвага укладу татарскага насельніцтва Беларусі, так і захавання этнаканфесійнай самабытнасці гэтага народа. Разам з тым намі атрымана своеасаблівае пацвярджэнне вялікай інтэграванасці татараў-мусульман у айчынныя кансалідацыйныя этнічныя працэсы. Аналіз крыніц і дакументаў сведчыць таксама і пра тое, што савецкая ўлада ў БССР зрабіла ўсё для таго, каб змяніць традыцыйны лад жыцця беларускіх татар, а ў выніку гэтага асяродкі захавання этнаканфесійнай спецыфікі гэтага народа былі разбураны. Ужо ў першыя гады савецкай улады былі закрыты мусульманскія школкі пры мячэцях. Крыху пазней, змагаючыся з праявамі рэлігійнасці, пачалі таксама закрываць мячэці. У 1936 г. была закрыта мячэць у Мінску. Будынак яе выкарыстоўваўся ў 1936–1941 гг. Беларускай канторай «Гастраном» як харчовая база [4, ф. 952, воп. 1, 17, 224; 18, 245–247]. Лічылася, што прадстаўнікі канфесій процідзейнічаюць мерапрыемствам дзяржавы, з'яўляюцца актыўнай контррэвалюцыйнай сілай. Сталін у гутарцы з амерыканскай рабочай дэлегацыяй (верасень 1927 г.) адзначыў, што партыя не павінна быць нейтральнай «у адносінах да рэакцыйнага духавенства, якое атручвае сумленне працоўных мас». Ён выказаў спадзяванне, што антырэлігійная прапаганда з'явіцца тым сродкам, «які павінен давесці да канца справу ліквідацыі рэакцыйнага духавенства» [8]. Антырэлігійная прапаганда на сталінскай мове азначала закрыццё мячэцей і фізічнае вынішчэнне кіраўнікоў мусульманскай канфесіі. Неабгрунтаваныя рэпрэсіі былі пастаўлены ў цэнтр дзейнасці партыйна-дзяржаўных органаў Беларусі.

У сакавіку 1933 г. у Мінску органамі АДПУ была арыштавана група татарскіх і беларускіх інтэлігентаў, якія абвінавачваліся па сумнавядомых артыкулах 72 і 76 Крымінальнага кодэксу БССР (антысавецкая агітацыя і прапаганда, удзел у контррэвалюцыйных органах). У сфабрыкаваным абвінаваўчым заключэнні па справе І.К. Гембіцкага, І.Х. Мурза-Мурзіча, І.Х. Рызвановіча і І.Х. Дашкевіча гаварылася, што «ў сакавіку 1933 г. была ліквідавана контррэвалюцыйная нацыяналістычная татарская групоўка, якой кіраваў былы падпалкоўнік царскай арміі Іван Канстанцінавіч (Ях'я Хасенавіч) Гембіцкі. У склад групоўкі ўваходзілі Ібрагім Халільевіч Мурза-Мурзіч, Хасень Іосіфавіч Рызвановіч, Іосіф Сямёнавіч Дашкевіч, Дзмітрый Іванавіч Даўгяла, Ібрагім Аляксандравіч Мухля. Контррэвалюцыйная татарская групоўка развівала арганізацыйную дзейнасць па стварэнні контррэвалюцыйнай арганізацыі за кошт татарскага рэлігійнага насельніцтва, варожа настроенага супраць Савецкай улады, распаўсюджваючы свой уплыў і на працоўных татар для стварэння контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі, якая ставіла сваёй мэтай звяржэнне Савецкай улады і ўстанаўленне рэспубліканска-дэмакратычнага ладу» [6, справа 31371-с, с. 63–69]. І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі асуджаны на тры гады высылкі ў Казахстан. Там жа, у Казахстане, яны былі паўторна асуджаны да вышэйшай меры пакарання. 10 кастрычніка 1989 г. рашэннем Пракуратуры БССР І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі рэабілітаваны пасмяротна [6, справа 31371-с, с. 126–129].

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Всесоюзная перепись населения 1926 года***: Белорусская Советская Социалистическая Республика. Т. Х. – М., 1928. – С. 9–13.
2. ***Цьвяткоў А.*** Некалькі слоў аб менскіх татарах // Наш край, 1927, № 6–7. – С. 13.

3. ***Гарэцкі Г.І.*** Нацыянальныя асаблівасці насельніцтва БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 г. // Полымя, 1929, № 5. – С. 84–85.
4. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*** Фонд 701, вопіс 1. 63. 7, 7 зв.
5. ***Каліта А.*** Нарысы рабочых акраін // Чырвоная змена, 1929, № 136 (805).
6. ***Архіў Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь.*** Справа 28329-с. – С. 18.
7. ***Савецкая Беларусь***, 1928, 5 мая.
8. ***Сталин И.*** Собр. соч. Т. 10. – М., 1953.

*S U M M A R Y*

*The national building in the 20–30s th didn't improve the state of the tatars in Belarus, as their traditional occupation, culture, right to religious beliefs were not considered.*